**Вернісаж.** Выстаўку «Жыццё як час сарванай ружы» да 70-годдзя з дня нараджэння мастака і паэта Фёдара Ястраба прадставілі ў галерэі «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі. У экспазіцыі дэманструецца аўтарскі жывапіс: выкананыя ў акварэлі эксперыменты майстра знаёмяць з яго ранняй творчасцю і мастацкім почыркам у перыяд пошуку, станаўлення стылю і манеры. Прадстаўлены таксама створаныя на працягу апошніх гадоў жыцця малафарматныя жывапісныя работы. Каля тысячы санетаў сабраны ў прадстаўленых на выстаўцы зборніках «Абяцанне сноў», «Вясёлкавы след», «Жыццё як час сарванай ружы», «Таўро», «Маленне агню і ветру». Экспануюцца і часопісы, матэрыялы навуковых канферэнцый, аўтарскія мастацтвазнаўчыя артыкулы і матэрыялы аб жыцці мастака, яго дзейнасці і творчасці, альбомы, каталогі выставак і праектаў. Галерыст, педагог, мастацтвазнавец Фёдар Ястраб (1953—2014) — аўтар і куратар мноства выставак і дзясяткаў маштабных праектаў, заснавальнік і першы загадчык аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі. Убачыць экспазіцыю можна да 9 красавіка.